Установа адукацыі
“Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў”

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**
Першы прарэктар
УА “Беларускі дзяржаўны
ўніверсітэт культуры і мастацтваў
________________Ю.П.Бондар
“____”___________2011 г.
Рэгістрацыйны № ВД-___/ вуч.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ЭКАНАМІЧНАЯ ТЭОРЫЯ

*Вучэбная праграма*
*для ўсіх спецыяльнасцей універсітэта*

Мінск 2011

**Складальнік**

*В.Я.Харэўскі*, дацэнт кафедры філасофіі ўстановы адукацыі "Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў", кандыдат эканамічных навук, дацэнт

**Рэцэнзенты:**

*Я.А.Аляхновіч,* дацэнт кафедры эканомікі ўстановы адукацыі "Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт інфарматыкі і радыёэлектронікі", кандыдат эканамічных навук, дацэнт;

*В.В.Нешытой,* загадчык кафедры інфармацыйных рэсурсаў установы адукацыі "Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў", доктар тэхнічных навук, прафесар

**Рэкамендавана да зацвярджэння:**

*кафедрай* філасофіі ўстановы адукацыі "Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў" (пратакол № 3 ад 20.04.2009 г.);

*прэзідыумам* навукова-метадычнага савета ўстановы адукацыі "Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў" (пратакол № 1 ад 05.10.2010 г.)

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Адказны за рэдакцыю *В.Б.Кудласевіч*
Адказны за выпуск *В.Я.Харэўскі*

## ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Вучэбная праграма па дысцыпліне “Эканамічная тэорыя” распрацавана ў адпаведнасці з тыпавой вучэбнай праграмай для вышэйшых навучальных устаноў для неэканамічных спецыяльнасцей, падрыхтаванай дзяржаўнай установай адукацыі “Рэспубліканскі інстытут вышэйшай школы” і зацверджанай Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь.

Эканамічная адукацыя з’яўляецца важнейшым элементам сацыяльна-гуманітарнай адукацыі, адной з частак фарміравання агульнага светапогляду.

“Эканамічная тэорыя” – вучэбная дысцыпліна, прадметам вывучэння якой з’яўляецца сістэма эканамічных адносін паміж людзьмі ў працэсе выбару эфектыўных шляхоў выкарыстання рэсурсаў у мэтах задавальнення патрэб грамадства ў таварах і паслугах.

Дысцыпліна “Эканамічная тэорыя” з’яўляецца пачатковай і базавай у вывучэнні ўсіх эканамічных дысцыплін: “Мікраэканоміка”, “Макраэканоміка”, “Сусветная эканоміка”, “Гісторыя эканамічных ведаў”, “Эканоміка культуры” і інш.

*Мэтай* дысцыпліны з’яўляецца вывучэнне эканамічных катэгорый і законаў, фарміраванне ўмення выкарыстоўваць веды эканамічнай тэорыі ў якасці метадалагічнай і тэарэтычнай базы пры вывучэнні канкрэтных эканамічных дысцыплін, а таксама ў практычнай дзейнасці.

*Задачы* вывучэння дысцыпліны:

– засваенне асноўных эканамічных паняццяў і праблем (прадмет, метады і функцыі эканамічных тэорый, патрэбнасці, рэсурсы, формы грамадскай гаспадаркі, эканамічныя сістэмы грамадства, попыт і прапанаванне, рыначная раўнавага, цэнаўтварэнне ва ўмовах рыначнай эканомікі, эканамічныя суб’екты гаспадарання, мэты і паказчыкі гаспадарчай дзейнасці, выдаткі, эканамічная і сацыяльная эфектыўнасць, асноўныя макраэканамічныя паказчыкі, сацыяльная палітыка дзяржавы, сусветная гаспадарка, сучасныя праблемы яе развіцця, асаблівасці эканамічнай дзейнасці Рэспублікі Беларусь ва ўмовах сусветнага фінансава-эканамічнага крызісу);

– вывучэнне асноўных законаў функцыянавання рынку (асноўны закон грашовага абарачэння, закон попыту і прапана-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

вання), спосабаў эфектыўнага скарыстання абмежаваных рэсурсаў;

– высвятленне межаў эфектыўнасці рыначнай сістэмы і дзяржаўнага рэгулявання эканомікі;

– вывучэнне асаблівасцей функцыянавання беларускай мадэлі эканамічнага развіцця.

У выніку вывучэння дысцыпліны "Эканамічная тэорыя" студэнты павінны *ведаць:*

– асноўныя эканамічныя паняцці і катэгорыі;

– сукупнасць эканамічных адносін паміж людзьмі пры выбары эфектыўных шляхоў скарыстання абмежаваных рэсурсаў у мэтах задавальнення патрэб грамадства ў таварах і паслугах;

– законы функцыянавання рыначнай эканомікі;

– асновы паводзін спажыўца і вытворцы ў рыначнай эканоміцы;

– спецыфіку эканамічных працэсаў у Рэспубліцы Беларусь;

– асноўныя рысы сучаснай сусветнай гаспадаркі;

*умець:*

– аналізаваць эканамічныя працэсы ў Рэспубліцы Беларусь і ў сусветнай гаспадарцы;

– сістэматызаваць і аналізаваць эканамічную інфармацыю з розных крыніц пры вырашэнні жыццёвых і прафесійных праблем;

– выкарыстоўваць эканамічныя веды для рацыянальнага рашэння аналітычных, навуковых і прафесійных задач;

– аргументаваць уласную пазіцыю пры абмеркаванні эканамічных праблем.

Падчас выкладання дысцыпліны "Эканамічная тэорыя" выкарыстоўваюцца метады эканамічнага мадэлявання, праблемна-пошукавы, эўрыстычны і іншыя.

Курс разлічаны на 138 гадзін, у тым ліку 76 аўдыторных заняткаў (46 лекцыйных і 30 семінарскіх). Па выніках вывучэння курса прадугледжаны экзамен.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ПРЫКЛАДНЫ ТЭМАТЫЧНЫ ПЛАН

| Раздзелы і тэмы | Колькасць аўдыторных гадзін | У тым ліку | |
|---|---|---|---|
| | | лекцыі | семінары |
| **Уводзіны** | 2 | 2 | |
| **Раздзел I. Агульныя палажэнні** | | | |
| *Тэма 1.* Эканамічная тэорыя: прадмет, функцыі і метады | 2 | 2 | |
| *Тэма 2.* Гісторыя развіцця эканамічных ведаў | 4 | 2 | 2 |
| *Тэма 3.* Эканамічныя патрэбнасці і рэсурсы. Праблема выбару ў эканоміцы | 2 | 2 | |
| *Тэма 4.* Формы грамадскай гаспадаркі. Эканамічныя сістэмы грамадства. Рыначная сістэма гаспадарання | 4 | 2 | 2 |
| **Раздзел II. Асновы мікраэканомікі** | | | |
| *Тэма 5.* Попыт і прапанаванне. Рыначная раўнавага. Эластычнасць попыту і прапанавання | 2 | 2 | |
| *Тэма 6.* Грошы. Закон грашовага абарачэння. Інфляцыя | 4 | 2 | 2 |
| *Тэма 7.* Эканамічныя суб'екты гаспадарання. Прадпрыемства. Паказчыкі гаспадарчай дзейнасці | 6 | 2 | 4 |
| **Раздзел III. Асновы макраэканомікі** | | | |
| *Тэма 8.* Нацыянальная эканоміка. Асноўныя макраэканамічныя паказчыкі | 4 | 2 | 2 |
| *Тэма 9.* Сацыяльная палітыка дзяржавы | 6 | 4 | 2 |
| *Тэма 10.* Рынкі фактараў вытворчасці | 10 | 6 | 4 |
| *Тэма 11.*Фінансавая сістэма і фіскальная палітыка дзяржавы | 4 | 2 | 2 |
| *Тэма 12.*Грашова-крэдытная сістэма і грашова-крэдытная палітыка дзяржавы | 4 | 2 | 2 |
| *Тэма 13.* Макраэканамічная раўнавага і нестабільнасць, формы іх праяўлення | 4 | 2 | 2 |
| **Раздзел IV. Сусветная эканоміка** | | | |
| *Тэма 14.* Сусветная гаспадарка. Асаблівасці і праблемы яе развіцця | 6 | 4 | 2 |
| *Тэма 15.* Формы міжнародных эканамічных адносін | 2 | 2 | |
| *Тэма 16.* Сістэма міжнародных эканамічных арганізацый і груповак, іх роля ў функцыянаванні і развіцці сусветнай гаспадаркі і асобных краін | 6 | 4 | 2 |
| *Тэма 17.* Знешнеэканамічная дзейнасць Рэспублікі Беларусь | 4 | 2 | 2 |
| **Разам…** | **76** | **46** | **30** |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ЗМЕСТ ДЫСЦЫПЛІНЫ

## Уводзіны

Паняцце эканомікі. Яе роля ў развіцці грамадства. Сучасныя тэндэнцыі развіцця эканомікі. Тэарэтычнае і практычнае значэнне курса “Эканамічная тэорыя” для спецыяліста-гуманітарыя. Арганізацыйныя пытанні вывучэння курса.

## Раздзел І. Агульныя палажэнні

### *Тэма 1. Эканамічная тэорыя: прадмет, функцыі і метады*

Паняцце эканомікі. Прадмет, межы, функцыі эканамічнай тэорыі. Структура эканамічнай тэорыі і яе месца ў сістэме эканамічных навук. Функцыі эканамічнай тэорыі. Эканамічныя законы і катэгорыі. Метады эканамічнай тэорыі. Эканамічная тэорыя і практыка. Узаемасувязь эканомікі і палітыкі.

### *Тэма 2. Гісторыя развіцця эканамічных ведаў*

Зараджэнне эканамічных ведаў. Эвалюцыя эканамічнай думкі: меркантылісты, фізіякраты, класікі, марксісты. Сучасныя напрамкі эканамічнай тэорыі: неакласічны, кейнсіянства, інстытуцыяналізм, манетарызм, неалібералізм. Сутнасць і асаблівасці тэорый.

### *Тэма 3. Эканамічныя патрэбнасці і рэсурсы. Праблема выбару ў эканоміцы*

Эканамічныя патрэбнасці: паняцце, структура, бязмежнасць. Закон узвышэння патрэбнасцей.

Эканамічныя даброты: класіфікацыя, асноўныя характарыстыкі.

Эканамічныя рэсурсы грамадства: зямля, праца, капітал, прадпрымальніцкая здольнасць. Абмежаванасць рэсурсаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Вытворчыя магчымасці грамадства і іх межы. Крывая вытворчых магчымасцей грамадства. Праблема выбару ў эканоміцы.

Эканамічная і сацыяльная эфектыўнасць.

*Тэма 4. Формы грамадскай гаспадаркі. Эканамічныя сістэмы грамадства. Рыначная сістэма гаспадарання*

Формы грамадскай гаспадаркі. Замкнутая (натуральная) гаспадарка. Таварная вытворчасць. Тавар: паняцце, уласцівасці. Спажывецкая вартасць. Менавая вартасць. Закон вартасці.

Уласнасць. Яе сутнасць, формы, віды. Рэфармаванне ўласнасці: нацыяналізацыя, раздзяржаўленне, прыватызацыя. Асаблівасці рэфармавання ўласнасці ў Рэспубліцы Беларусь.

Паняцце аб эканамічнай сістэме, яе элементы і структура.

Тыпы эканамічных сістэм: традыцыйная, рыначная, планава-рэгулюемая (цэнтралізаваная), змешаная – асноўныя рысы.

Рынак, віды, функцыі. Рыначная інфраструктура. Канкурэнцыя: сутнасць, яе віды і роля ў эканоміцы.

Мадэлі рыначнай эканомікі. Функцыі дзяржавы ў сучаснай рыначнай эканоміцы, метады яе рэгулявання. Антыманапольнае рэгуляванне.

## Раздзел II. Асновы мікраэканомікі

*Тэма 5. Попыт і прапанаванне. Рыначная раўнавага. Эластычнасць попыту і прапанавання*

Попыт. Цана попыту. Цэнавыя і нецэнавыя фактары попыту. Закон попыту. Эластычнасць попыту.

Вартасць і рацыянальны спажывец. Закон змяншэння вартасці і яго ўздзеянне на попыт. Прынцып максімізацыі вартасці. Перавагі спажыўца і крывыя абыякавасці. Бюджэтныя абмежаванні спажыўца. Эфект замяшчэння і эфект даходу ў паводзінах спажыўца.

Прапанаванне. Цана прапанавання. Цэнавыя і нецэнавыя фактары прапанавання. Эластычнасць прапанавання.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Узаемадзеянне попыту і прапанавання, іх уздзеянне на цэнаўтварэнне. Рыначныя і рэгулюемыя цэны.

### *Тэма 6. Грошы. Закон грашовага абарачэння. Інфляцыя*

Узнікненне грошай. Функцыі і віды грошай. Попыт на грошы. Прапанаванне грошай. Грашовыя агрэгаты. Асноўны закон грашовага абарачэння.

Інфляцыя: сутнасць, прычыны. Тыпы інфляцыі. Сацыяльна-эканамічныя наступствы інфляцыі. Антыінфляцыйная палітыка дзяржавы.

### *Тэма 7. Эканамічныя суб’екты гаспадарання. Прадпрыемства. Паказчыкі гаспадарчай дзейнасці*

Эканамічныя суб’екты гаспадарання: хатняя гаспадарка, прадпрыемства, дзяржава. Іх роля і ўзаемасувязь у гаспадарчай дзейнасці.

Прадпрыемства (фірма): мэты і асноўныя функцыі. Арганізацыйна-прававыя формы і віды прадпрыемстваў (фірм). Паказчыкі гаспадарчай дзейнасці. Выдаткі, іх віды. Сабекошт прадукцыі, даходы прадпрыемства, прыбытак, рэнтабельнасць: сутнасць паняццяў. Шляхі павелічэння эфектыўнасці гаспадарання.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Раздзел ІІІ. Асновы макраэканомікі

### *Тэма 8. Нацыянальная эканоміка. Асноўныя макраэканамічныя паказчыкі*

Нацыянальная эканоміка. Структура нацыянальнай эканомікі: матэрыяльная і нематэрыяльная сферы, галіновая і тэрытарыяльная структуры. Мэты і паказчыкі развіцця нацыянальнай эканомікі.

Валавы нацыянальны прадукт. Валавы ўнутраны прадукт. Чысты нацыянальны прадукт. Нацыянальны даход. Нацыянальнае багацце.

Эканамічны рост. Фактары і тыпы росту нацыянальнай эканомікі.

Эканамічная эфектыўнасць: паняцце, паказчыкі, шляхі павышэння.

Сацыяльная эфектыўнасць: паняцце, паказчыкі, узаемасувязь з эканамічнай эфектыўнасцю.

*Тэма 9. Сацыяльная палітыка дзяржавы*

Сацыяльная палітыка дзяржавы, паняцце, мэты, функцыі.

Узровень і якасць жыцця. Спажывецкі кошык, мінімальны спажывецкі бюджэт і бюджэт пражытачнага мінімуму.

Даходы насельніцтва, крыніцы іх фарміравання: заработная плата, (функцыі і формы аплаты працы), прадпрымальніцкая дзейнасць, сацыяльныя выплаты (пенсіі, дапамога па беспрацоўі, інваліднасці і інш.).

Расходы насельніцтва. Суадносіны даходаў і расходаў насельніцтва як паказчык узроўню якасці жыцця. Праблема няроўнасці даходаў.

Роля дзяржавы ў вырашэнні праблем сацыяльнай падтрымкі насельніцтва.

*Тэма 10. Рынкі фактараў вытворчасці*

Фактары вытворчасці. Асаблівасці попыту на фактары вытворчасці. Аптымальныя суадносіны ў выкарыстанні рэсурсаў.

Прыродныя рэсурсы. Асаблівасці рынку прыродных рэсурсаў. Сацыяльна-эканамічная вартасць зямлі. Фактары, якія вызначаюць каштоўнасць тэрыторый: прыродныя, эканамічныя, сацыяльныя. Рэнта, віды рэнты, арэндная плата. Цана зямлі.

Рынак працы. Попыт і прапанаванне на рынку працы на розных этапах развіцця нацыянальнай эканомікі. Заработная плата: намінальная і рэальная. Беспрацоўе. Тыпы беспрацоўя. Эканамічныя і сацыяльныя наступствы беспрацоўя. Закон Оўкена. Рыначныя і дзяржаўныя меры забеспячэння занятасці насельніцтва, сацыяльнай падтрымкі беспрацоўных і стымулявання іх уключэння ў працоўны працэс.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Рынак капіталу. Капітал асноўны і абаротны. Попыт на капітал. Пазыковы капітал. Крэдыт. Віды і формы крэдыту. Пазыковы працэнт: сутнасць, крыніцы, фактары, межы.

Інвестыцыі. Рынак каштоўных папер.

*Тэма 11.Фінансавая сістэма*
*і фіскальная палітыка дзяржавы*

Фінансавая сістэма: паняцце, структура.

Дзяржаўны бюджэт і яго функцыі. Крыніцы фарміравання даходнай часткі бюджэту. Бюджэтны дэфіцыт. Бюджэтны доўг: прычыны ўзнікнення. Унутраны і знешні дзяржаўны доўг. Мясцовыя бюджэты. Крыніцы фарміравання, стацці выдаткаў. Кансалідаваны бюджэт.

Падаткі: сутнасць і функцыі. Элементы падатку: суб'ект, аб'ект, стаўка падатку. Віды падаткаў. Прамыя і ўскосныя падаткі. Крывая Лафера.

Фіскальная і фінансавая палітыка Рэспублікі Беларусь, яе напрамкі, механізмы, вынікі.

*Тэма 12. Грашова-крэдытная сістэма*
*і грашова-крэдытная палітыка дзяржавы*

Грашова-крэдытная сістэма дзяржавы. Яе ўзроўні.

Банкі, іх віды, функцыі, аперацыі.

Грашова-крэдытная палітыка дзяржавы, яе мэты, метады і інструменты.

Асаблівасці грашова-крэдытнай палітыкі Рэспублікі Беларусь.

*Тэма 13. Макраэканамічная раўнавага*
*і нестабільнасць, формы іх праяўлення*

Мадэль сукупнага попыту і сукупнага прапанавання. Крывыя сукупнага попыту і прапанавання. Нецэнавыя фактары сукупнага попыту і сукупнага прапанавання. Агульная макраэканамічная раўнавага, змены ў раўнавазе.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Цыклічны характар эканамічнага развіцця. Тэорыі эканамічных цыклаў. Віды цыклаў. Фактары, якія вызначаюць эканамічныя цыклы. Фазы цыклаў. Крызісы.

Сучасны сусветны фінансава-эканамічны крызіс. Яго прычыны і наступствы.

Вопыт дзяржаўнага кіравання па змяншэнні негатыўных наступстваў крызісаў і паскарэнні выхаду з дэпрэсіі да ажыўлення і пад'ёму эканомікі.

## Раздзел IV. Сусветная эканоміка

### *Тэма 14. Сусветная гаспадарка. Асаблівасці і праблемы яе развіцця*

Паняцце "сусветная гаспадарка". Асноўныя этапы яе фарміравання.

Міжнародны падзел працы як аснова станаўлення і развіцця сусветнай гаспадаркі.

Асноўныя сучасныя тэндэнцыі развіцця сусветнай гаспадаркі: спецыялізацыя, кааперацыя, глабалізацыя, інтэграцыя. Роля транснацыянальных карпарацый у сусветнай эканоміцы.

Уздзеянне сучаснага фінансава-эканамічнага крызісу на тэндэнцыі і праблемы развіцця сусветнай эканомікі.

### *Тэма 15. Формы міжнародных эканамічных адносін*

Тэндэнцыі развіцця міжнародных эканамічных адносін у XXI ст.

Роля міжнароднага гандлю ў сучасны перыяд. Экспарт і імпарт тавараў і паслуг. Палітыка свабоднага гандлю. Пратэкцыянізм.

Міжнародныя плацёжныя сродкі. Валютны рынак і валютны курс. Фактары, якія ўздзейнічаюць на валютны курс. Віды валютнага курса. Канвертуемасць валют.

Плацёжны баланс як абагульняючы паказчык знешнеэканамічнай дзейнасці краіны.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Міжнародныя міграцыйныя працэсы: міграцыя рабочай сілы, “уцечка мазгоў”, негатыўныя і пазітыўныя наступствы гэтых працэсаў.

Абмен у галіне навукі і тэхналогій, формы ўзаемадзеяння.

*Тэма 16. Сістэма міжнародных эканамічных арганізацый і груповак, іх роля ў функцыянаванні і развіцці сусветнай гаспадаркі і асобных краін*

Сістэма міжнародных эканамічных арганізацый і груповак (Міжнародны валютны фонд, Усясветная гандлёвая арганізацыя, Еўрасаюз, СНД, ЕўрАзЭС, Саюз Беларусі і Расіі і інш.), іх роля ў функцыянаванні і развіцці сусветнай гаспадаркі і асобных краін.

Удзел Беларусі ў сістэме міжнародных эканамічных арганізацый і груповак.

*Тэма 17. Знешнеэканамічная дзейнасць Рэспублікі Беларусь*

Месца і патэнцыяльныя магчымасці гаспадарчага комплексу Беларусі ва ўдзеле ў сусветнай гаспадарцы.

Паказчыкі знешнеэканамічнай дзейнасці Рэспублікі Беларусь: аб’ём тавараабароту, структура знешнегандлёвага балансу (экспарт – імпарт). Асноўныя гандлёвыя партнёры.

Асаблівасці ўздзеяння сучаснага сусветнага фінансавага крызісу на знешнеэканамічную палітыку Рэспублікі Беларусь.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ІНФАРМАЦЫЙНАЯ ЧАСТКА

## Літаратура

*Асноўная*

1. *Базылев, Н.И.* Экономическая теория: учеб. пособие для студентов неэкономических специальностей вузов / Н.И.Базылев, М.Н.Базылева. – Минск: Книжный дом, 2005. – 320 с.

2. *Головачев, А.С.* Экономическая теория (Общие основы): курс лекций / А.С.Головачев, И.В.Головачева, Э.А.Лутохина. – Минск: Академия управления при Президенте Республики Беларусь, 2004. – 240 с.

3. *Кажуро, Н.Я.* Основы экономической теории: учеб. пособие / Н.Я.Кажуро. – Минск: ООО “ФУ Аинформ”: ООО “Мисанта”, 2003. – 670 с.

4. *Клюня, В.Л.* Экономическая теория: учеб. пособие / В.Л.Клюня, И.В.Новикова, М.Л. Зеленкевич [и др.]; под ред. В.Л.Клюни, И.В.Новиковой. – Минск: ТетраСистемс, 2002. – 400 с.

5. *Плотницкий, М.И.* Экономическая теория (Общие основы): учеб. пособие / М.И.Плотницкий, М.К.Радько, Г.А.Шмарловская [и др.]; под ред. М.И.Плотницкого. – Минск: ООО “Современная школа”, 2006. – 392 с.

*Дадатковая*

1. *Бондарь, Н.Н.* Социальная политика в Республике Беларусь: учеб. пособие / Н.Н.Бондарь, А.И.Терлиженко. – Минск: БГЭУ, 2005. –146 с.

2. *Гукасьян, Г.И.* Экономическая теория. Ключевые вопросы / Г.И.Гукасьян. – М.: “Инфра-М”, 1998. – 284 с.

*Макконел, К.Р.* Экономикс: принципы, проблемы и политика / К.Р.Макконел, С.Л.Брю. – М.: ИНФРА-М, 2001. – 974 с.

3. *Новикова, И.В.* Экономическая теория: курс интенсивной подготовки / И.В.Новикова, Ю.М.Ясинский. – Минск: ТетраСистемс, 2010. – 400 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

4. *Шмарловская, Г.А.* История экономических учений: учеб. пособие / Г.А.Шмарловская, А.Н.Тур, Е.Е.Лебедько [и др.]; под ред. Г.А.Шмарловской. – Минск: ООО “Новое знание”, 2000. – 340 с.

5. *Экономика:* справочник студента / С.С.Ильин, Т.И.Васильева. – М.: ООО “Издательство АСТ”, 2000. – 544 с.

6. *Экономическая* теория. Системный курс: учеб. пособие / под ред. Э.И.Лобковича. – Минск: ООО “Новое знание”, 2000. – 664 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Вучэбнае выданне*

**ЭКАНАМІЧНАЯ ТЭОРЫЯ**

*Вучэбная праграма*
*для ўсіх спецыяльнасцей універсітэта*

Карэктар В.Б.Кудласевіч
Тэхнічны рэдактар А.У.Гіцкая

Падпісана ў друк 2011 г. Фармат 60x84 $^1/_{16}$.
Папера пісчая № 2. Ум. друк. арк. 0,85. Ул.-выд. арк. 0,44.
Тыраж экз. Заказ .

Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў.
Вул. Рабкораўская, 17, 220007, г. Мінск.
Ліцэнзія № 02330/0003939 ад 19.05.2011 г.

Надрукавана на рызографе
Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў.
Вул. Рабкораўская, 17, 220007, г. Мінск.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ